# Аляксей Андрэевіч Лузгін

Герой Савецкага Саюза Нарадзіўся *01.02.1920* г. ў в. Загараддзе. Продкі перасяленцы на Талачыншчыну з разанскіх сялян



Продкі перасяленцы на Талачыншчыну з разанскіх сялян.
Пасля смерці бацькі, у 1931 годзе, Аляксей пераехаў да брата Сцяпана ў Маскву, там ён у 1936 годзе скончыу восем класаў школы. У 1936-1937 гадах працаваў падсобным рабочым на Маскоўскім электраматорным заводзе, у 1937-1939 гадах - нарядчиком выпраўным брыгад у 1-м Маскоўскім пасажырскім аддзяленні Кастрычніцкай чыгункі. Потым – лётные вучылішча.



Выпускнік лётнага вучылішча Аляксей Лузгін яшчэ не паспеў атрымаць накіраванне ў вайсковай часці, як радыё прынесла страшную вестку: вайна. Малады лётчык не мог дачакацца таго дня, калі яму дадуць самалёт, каб змагацца з ворагам, аднак па загаду начальніка вучылішча ён застаўся працаваць інструктарам. З такім назначэннем цяжка было зміріцца.
І толькі праз год ён трапіў у полк далёкіх разведчыкаў рэзерву Галоўнага камандавання. У красавіку 1943 - маі 1945 - лётчык і камандзір звяна 4-га асобнага разведвальнага авіяцыйнага палка. Удзельнічаў у Курскай бітве, вызваленні левабярэжнай Украіны, бітве за Дняпро, Корсунь-Шаўчэнкаўскі, Львоўска-Сандамірскай, Вісла-Одэрская, Берлінскай і Пражскай аперацыях.





За час вайны зрабіў 116 баявых вылетаў, правёў 32 паветраныя баі. Ад камандзіра звяна ён вырас да намесніка камандзіра палка па лётнай падрыхтоўцы. За мужнасць і гераізм, за ратныя подзвігі праяўленыя ў баях 15 мая 1946 г. старэйшаму лейтэнанту Лузгіну Аляксею Андрэевічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медалі «Залатая Зорка». Пасля вайны А.А.Лузгін лятаў на рэактыўных самалётах, вучыў лётнаму майстэрству савецкіх салдатаў. У 1960г. ў званні палкоўніка выйшаў у адстаўку. Часта прыязджаў на Талачыншчыну, наведваў сваю родную вёску Загараддзе, дзе прайшлі гады яго дзяцінства, адкуль пачаў свой слаўны жыццёвы шлях.
Жыў у Маскве. Памёр 10 студзеня 1977 года. Пахаваны на Кунцаўскі могілках у Маскве.



Лычковский Максим Юрьевич,
СФ 11201418

Белорусский национальный технический университет

Управление по воспитательной работе с молодежью

Выставка "История Великой
Отечественной войны в лицах"

М. Ю. Лычковский

# ЛУЗГІН
# АЛЯКСЕЙ АНДРЭЕВІЧ

Минск БНТУ 2019